# «Белтэлекам» працягвае развіваць сеткі GPON у Баранавічах

У 2017 годзе Брэсцкі філіял РУП "Белтэлекам" плануе пераключыць на тэхналогію GPON парадку 12 тысяч абанентаў Баранавічаў і Баранавіцкага раёна.

У чэрвені оптавалакно прыйдзе ў мікрараён «Паўночны» раённага цэнтра. Пераключэнне на GPON тут пачнецца з вуліц Наканечнікава (1, 3, 5, 7, 9, 11, 13, 15, 15/1, 17, 19, 21, 23), Жукава (2, 2/1, 14/3, 14/4, 16/3, 16/4, 16/7), бульвара Барадзінскага (2, 3, 4, 4А, 5, 6, 8, 9/1, 9/2, 11), праспекта Савецкага (9, 15).

У бліжэйшы час у Баранавічах абанентаў дамоў па вуліцах Дзяржынскага (3, 3/1), Пірагова (4, 6), Савецкая (85, 88, 108, 100, 101а, 102), Міцкевіча 2, Камсамольская (100, 102) таксама перавядуць на GPON.

У Баранавіцкім раёне вядуцца работы па будаўніцтве сетак сувязі ў вёсцы Казлякевічы і пасёлку Мір. На чэрвень запланаваны пачатак будаўніцтва сетак у вёсцы Крашын.

Брэсцкі філіял РУП «Белтэлекам» ужо пераключыў на тэхналогію GPON больш за 28 тысяч абанентаў Баранавіцкага раёна. Сеткамі GPON ахоплены мікрараён Бараўкі, мікрараён Тэкстыльны, частка мікрараёна Паўднёвы, дома па вуліцы Тэксэр, некаторыя дамы па вуліцы Брэсцкай, практычна ўся вуліца Паркавая і месцамі цэнтр горада. У прыгарадзе оптавалакно падключылі ў аграгарадку Жамчужны, вёсцы Зорная, пасёлку Акцябрскі і часткі вёскі Вялікая Каўпеніца.

Тэхналогія GPON забяспечвае:

- падлучэнне некалькіх тэлевізараў да ZALA. Якасны малюнак у лічбавым фармаце, прагляд тэлеканалаў у HD-якасці, функцыі паўза, перамотка, запіс, архіў, прагляд па запыце;
- павелічэнне ў дзесяткі разоў хуткасцяў доступу ў інтэрнэт byfly на тарыфных планах «Рэкорд» і пакетах паслуг «Ясна» і «Ясна плюс». Хуткая запампоўка, прагляд фільмаў онлайн;
- шырокі спектр дадатковых тэлефонных сэрвісаў: Музычны марафон, Вызначальнік нумара, Выбар нумара і іншых.

---

**Source URL:** *https://www.mpt.gov.by/news/16-06-2017-2064*